УДК 821.161.3.09

***Н.В. НАРЫНКЕВІЧ***

# АСЭНСАВАННЕ ГІСТОРЫІ І БУДУЧЫНІ БЕЛАРУСІ Ў МАСТАЦКАЙ ПУБЛІЦЫСТЫЦЫ ЯНКІ СІПАКОВА (цыкл "Партрэт Беларусі")

*У артыкуле аналізуецца мастацкая публіцыстыка аднаго са старэйшых беларускіх пісьменнікаў Янкі Сіпакова на матэрыяле апошняга перыяду (2000 – 2006 гг.). Даследуюцца эсэ цыкла "Партрэт Беларусі" і вызначаюцца іх характэрныя рысы, робіцца спроба класіфікацыі твораў. Разглядаецца канцэпцыя пісьменніцкага асэнсавання гісторыі і сучаснасці нашай дзяржавы, падкрэсліваецца арыгінальнасць аўтарскага падыходу ў адлюстраванні галоўных тэм, сувязь мінулага і будучыні ў свядомасці пісьменніка. Асэнсоўваецца роля цыкла твораў у сучаснай беларускай публіцыстыцы, падкрэсліваецца іх скіраванасць на захаванне нацыянальных адметнасцей у кантэксце глабалізацыі сусветнага грамадства. Вылучаюцца асаблівасці аўтарскага стылю. Звяртаецца ўвага на ідэю пераемнасці традыцый савецкай публіцыстыкі і сучасных журналісцкіх твораў Я. Сіпакова, вылучаецца сувязь эсэ з мастацкай прозай. Даказваецца неабходнасць захавання лепшых адметнасцей айчыннай нарысістыкі ў сучаснай перыёдыцы.*

Янка Сіпакоў – прызнаны майстар лірыка-псіхалагічнай плыні ў беларускай публіцыстыцы. У апошні час ён актыўна асвойвае новыя формы падачы матэрыялу ў сваёй творчасці, звяртаецца да эсэістычнага накірунку, з дапамогай якога асэнсоўвае ўласны жыццёвы і творчы вопыт, па-філасофску абагульняе перажытае краінай. Цікавасць і арыгінальнасць жанравых форм, характэрны для гэтага аўтара лірызм у публіцыстыцы і пранікненне ў журналісцкія творы элементаў мастацкай прозы даказваюць неабходнасць і актуальнасць захавання традыцый яго творчасці, асабліва сёння, калі ўсё часцей у журналістыцы пераважаюць інфармацыйныя жанры, пагоня не толькі за правераным фактам, але і за сенсацыйнымі чуткамі. Своеасаблівым падагульненнем творчай дзейнасці Янкі Сіпакова за апошнія некалькі год можа служыць цыкл твораў, над якім аўтар пачынае працаваць напачатку 2000-х гг. Зараз да выдання ім падрыхтаваная кніга "Зялёны лісток на планеце Зямля. Партрэт Беларусі". Гэта аб'яднаныя агульнай ідэяй расповеды пра розныя аспекты існавання беларусаў у свеце. У кнігу ўваходзіць трыццаць эсэ, большасць з якіх была надрукаваная ў айчыннай перыёдыцы апошніх гадоў. Разам з тым даследчыцкі аналіз творчай спадчыны пісьменніка часцей датычыцца савецкага перыяду дзейнасці (артыкулы У. Юрэвіча, С. Андраюка, М. Лобана і інш., манаграфія А. Лысенкі "Лінія гарызонта: На-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

рыс творчасці Янкі Сіпакова", 1986 г.). Такім чынам, вялікі пласт творчасці пісьменніка застаўся нібы па-за ўвагай сучасных крытыкаў.

Рубрыка "Партрэт Беларусі" пачала сваё існаванне ў часопісе "Беларусь" напачатку 2002 г. Усе творы друкаваліся на першай старонцы – традыцыйным для рэдактарскай калонкі месцы. Аўтар Янка Сіпакоў так патлумачыў галоўную мэту з'яўлення рубрыкі: "Мы мяркуем напісаць партрэт Беларусі. Найперш – для саміх сябе. А таксама для тых, хто мала ведае пра нашу краіну і, магчыма, нават не ўяўляе, у якім месцы зямнога шара мы знаходзімся, жывем, працуем.

Мы хочам, каб кожны, хто будзе сачыць за рубрыкаю «Партрэт Беларусі», нават не пабываўшы ў нас, мог усклікнуць: "Якая ж гэта прыгожая і жыццядайная зямля і якія цудоўныя і мудрыя людзі жывуць на ёй!»" [1, с. 1].

Сіпакоў звяртаецца са "Словам да Радзімы", у якім праслаўляе найлепшую ў свеце краіну, сцвярджаючы думку, што нельга ніколі разлучыць народ са сваёй зямлёй, і са "Словам да чытача", дзе заклікае яго ганарыцца сваёй Бацькаўшчынай, продкамі, сваім народам: "І ніякія мы не зломкі і не затурканыя. Мы – вялікі старажытны народ – мудры і светлы, чысты і даверлівы, узычлівы і дабрадушны, памяркоўны і разважлівы. Падобны да іншых народаў свету.

Кожны з нас мае радасць ганарыцца, што належыць менавіта да такога народа і да такой зямлі" [1, с. 1].

Большасць эсэ маюць лаканічныя, сціслыя загалоўкі, якія выражаюць сэнс твораў: "Наша мова", "Нашы грошы", "Наша ежа", "Нашы песні", "Нашы замкі" і г.д. Сіпакоў закранае самыя розныя бакі жыцця беларусаў, і яго творы часам нагадваюць па сваёй змястоўнасці і інфарматыўнасці разгорнутыя энцыклапедычныя артыкулы. Разам з тым ад навуковых твораў іх адрознівае жывая, эмацыянальная, экспрэсіўная мова.

Можна раздзяліць эсэ цыкла на пэўныя падгрупы па сваёй тэматыцы: геаграфічныя, гістарычныя, культуралагічныя, побытавыя (прысвечаныя паўсядзённаму жыццю беларусаў). Так, частка з іх прысвечаная геаграфіі краіны, напрыклад, "Наша зямля", "Нашы дарогі", "Нашы лясы", "Наша вада" і некаторыя іншыя.

Сіпакоў выкарыстоўвае трапныя параўнанні, прыводзіць цікавыя агульна- і малавядомыя факты: "Як кажуць, на нашай тэрыторыі магло б размясціцца аж пяць Швейцарый. Ці Літва, Латвія і Эстонія разам узятыя. І яшчэ б на Люксембург месца хапіла. І нават крыху засталося б" [2, с. 1].

Сухія навуковыя даныя Сіпакоў умее ператварыць ў метафару дзякуючы паэтычнасці свайго светаадчування. Ён інтрыгуе чытача першымі словамі фразы: "Нашы рэкі часцей за ўсё бяруць пачатак не на зямлі, а ў небе". Тлумачэнне такога арыгінальнага факта дастаткова простае, што тлумачыцца далей: "Іх нараджаюць хмары. Ападкі ў выглядзе дажджу і снегу, калі ён растае, становяцца вытокамі нашых рэк і рэчак" [3, с. 1]. Такім чынам, аўтарскі, арыгінальны падыход у асэнсаванні нават такіх, здавалася б, простых рэчаў відавочны.

У эсэ Сіпакоў выступае не толькі як таленавіты пісьменнік, але і як выдатны знаўца беларускай культуры, фальклору, мудры дарадчык, што імкнецца перадаць веды, назапашаныя ўласным жыццёвым вопытам, наступным пакаленням. Разам з тым работа над гэтымі творамі, безумоўна, патрабавала і знаёмства з вузкаспецыяльнымі звесткамі, працы з архіўнымі дакументамі. Сіпакоў выкарыстоўвае народную памяць, выклікаючы з нябыту страчаныя ў стагоддзях словы і з'явы, і разам з тым адлюстроўвае сучасную рэчаіснасць.

Між тым, творы пабудаваны не толькі на аснове агульнавядомых ісцін – Сіпакоў заўсёды імкнецца ўбачыць новы ракурс у раскрыцці пэўнай тэмы. Так, вада для яго – гэта не толькі рэкі, азёры, балоты, снег, дождж і лёд, але і калодзежы беларусаў, святыя крыніцы (прошчы), ля якіх у даўніну будавалі храмы. Распавя-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

даючы пра "Нашы камяні", ён спалучае звесткі пра матэрыяльную і духоўную культуру, таму што для беларуса аднолькава важныя і скандынаўскія валуны, што прыйшлі на Беларусь з апошнім ледавіком і сталі неад'емнай часткай навакольнага пейзажу, і камяні-сімвалы, святыні, такія, як Барысавы валуны або талеркі Вітаўта. Тут жа ўзгадваецца і музей камянёў, што існуе ў Мінску з 1985 г., і прыказкі, прымаўкі, звязаныя з тэмай эсэ. Такім чынам, аўтар стварае абагуленую карціну пра з'яву, вынесеную ў загаловак, і яе існаванне ў беларускай гісторыі і сучаснасці.

Эсэ, прысвечаныя духоўнаму жыццю, культуры беларусаў, больш скіраваныя на адлюстраванне мінулага, аднак нямала ёсць і твораў, дзе фактаалагічнай асновай для аўтара служыць перш за ўсё сённяшняя рэчаіснасць. Так, "Нашы дарогі" – гэта паўнавартасны аналіз усіх трас і магістралей Беларусі, цэнтральнаеўрапейскай краіны, якая звязвае Расію і Захад з дапамогай аўтамабільных, чыгуначных, паветраных шляхоў, газа- і нафтаправодаў, шматлікіх мастоў і рачных артэрый. Аўтар распавядае і пра ўнутраныя важныя дарогі Беларусі, напрыклад, метро ў Мінску або падземныя дарогі ў салігорскіх шахтах. Заканчвае Сіпакоў эсэ словамі, што вельмі выразна адлюстроўваюць як галоўныя рысы менталітэту беларускай нацыі (адкрытасць, шчырасць, добразычлівасць), так і асноўную скіраванасць міжнароднай палітыкі краіны: "Беларусь, якая знаходзіцца ў самым цэнтры Еўропы, асуджана быць краінай гасцінных дарог. Каб людзі з чыстай душою і светлым сумленнем маглі вольна ісці і ехаць па іх, куды ім захочацца" [4, с. 1].

Апісваючы "Нашы вятры, дажджы, маразы", аўтар прыводзіць шматлікія прыклады з так званай "народнай метэаралогіі" – прыкметы, звязаныя з надвор'ем, узгадвае напалову забытыя азначэнні прыродных з'яў: дажджы-каплюны, церабуны, грыбасеі; вераб'іныя, або рабінавыя, ночы; вясновыя чаромхавыя халады; піша пра адметнасці стылю беларускіх мастакоў-пейзажыстаў Леаніда Шчамялёва, Вітольда Бялыніцкага-Бірулі. Сіпакоў выступае і як уважлівы назіральнік за сучаснасцю, аналізуе прыродныя стыхіі (ураганы) апошніх гадоў і тыя пашкоджанні, што яны нанеслі народнай гаспадарцы рэспублікі.

Сучаснасць і мінулае цесна пераплеценыя і ў эсэ "Нашы гарады і мястэчкі". Пачынаючы з даўняй легенды пра паходжанне назвы горада Браслава, аўтар разам з краінай праходзіць усю гісторыю існавання беларускіх гарадоў: ад старажытных Полацка і Віцебска да маладых Салігорска, Новалукомля, Белаазёрска, што з'явіліся на нашай карце ўжо ў савецкі час, знаёміць чытача з асаблівасцямі побыту і археалагічнымі помнікамі гэтых мясцін.

Не менш значнай з'яўляецца частка эсэ з цыкла "Партрэт Беларусі", якія распавядаюць пра духоўнае жыццё нашай нацыі, яе гісторыю і культуру на працягу двух апошніх тысячагоддзяў. Так, адным з першых сярод іх быў надрукаваны тэкст твора "Наша мова", што, несумненна, сведчыць не толькі пра павагу аўтара да роднага слова, але і пра агульнаграмадскую значнасць існавання і развіцця беларускай мовы. Дарэчы, Сіпакоў выказвае даволі арыгінальную гіпотэзу пра тое, што менавіта шматвяковая забарона ўжытку беларускай мовы спрыяла развіццю вуснага фальклору, які лічыцца, па яго словах, найбагацейшым у свеце.

Блізкія, сугучныя гэтаму твору эсэ, прысвечаныя "Нашым песням" і "Нашым святам", а таксама "Нашым святыням і сімвалам", у якіх Сіпакоў расказвае пра жніўныя, касецкія, праполачныя, дажынкавыя, талочныя, веснавыя і іншыя працоўныя песні гаспадарчага календара, пра калыханкі і народных спевакоў (спявух, пеюноў, пяюлляў), Дзяржаўную акадэмічную харавую капэлу пад кіраўніцтвам Рыгора Шырмы і ансамбль "Песняры", суіснаванне ў беларускай культуры

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

язычніцтва і хрысціянства, старажытнае свята Пахаванне Стралы, прысвечанае першай веснавой маланцы, аналагаў якога няма ў свеце, і сімвалы Беларусі, сярод якіх не толькі дзяржаўныя – герб, гімн, сцяг, – але і спрадвечныя народныя – Зямля, мова, Сафійскі сабор, Няміга, зубр, бусел, васілёк, міфалагічны сімвал папараць-кветка. Тут, як і раней, Сіпакоў здзіўляе чытача парадаксальным вывадам:

"... то ж добра, што ўкралі наш Жыватворны Крыж (маецца на ўвазе Крыж св. Еўфрасінні Полацкай)!

Згублены крыж – гэта наша надзея.

Знойдзены – гэта наша святыня.

Будзем жа шукаць, каб знайсці яе!

Бо наша краіна, наша Беларусь будзе жыць, пакуль ёй ёсць што шукаць і ёсць што знаходзіць!" [5, с. 46].

Аўтар, безумоўна, верыць у будучыню беларускай дзяржавы і народа. Пра гэта сведчаць, напрыклад, развагі ў эсэ "Наша адзенне", дзе ён прасочвае гісторыю развіцця айчыннай моды ад першых жаночых спадніц і андаракаў да сённяшніх поспехаў беларускіх прадпрыемстваў "Элема" і "Мілавіца", мадэльнага агенцтва Сашы Варламава і яго штогадовага конкурсу "Мельница моды". Такім чынам, перш за ўсё творы Янкі Сіпакова скіраваныя на абуджэнне пачуцця гонару за нашу краіну, цікаўнасці да яе гісторыі і жадання ўдзельнічаць у сучасных справах сваёй дзяржавы, прыўносіць свой уклад у яе годнае існаванне ў свеце. Эсэ "Нашы грошы", "Наша ежа", "Наша фауна" будуць цікавыя нават самаму патрабавальнаму чытачу малавядомымі звесткамі пра мінулае. "Наш гумар" запэўніць у самадастатковасці нацыі: "Не ведаю, ці разумеем мы, што з самога сябе можа смяяцца толькі разумны, мудры, упэўнены ў сабе чалавек, але ж мы найперш смяёмся менавіта з саміх сябе... Здаровы смех – здаровая нацыя!" [6, с. 1]. А эсэ "Наша неба, наш космас" пазнаёміць не толькі са старажытнымі паганскімі ўяўленнямі беларусаў пра космас і легендамі пра стварэнне нябесных свяцілаў, але і з асобамі філосафа з Мсціслаўшчыны Анёла Доўгірда, які яшчэ ў далёкім XVI ст. падтрымліваў погляды Каперніка, першага беларускага касманаўта Пятра Клімука і "беларускага Леанарда да Вінчы" Язэпа Драздовіча.

Аднак нельга сцвярджаць, што Сіпакоў не заўважае праблем і хібаў сучаснага грамадства, дэманструючы толькі яго дасягненні, не звяртаецца да балючых падзей у гісторыі нашай дзяржавы. Так, распавядаючы пра беларускія замкі, ён з горыччу канстатуе, што большасць з іх не захавалася да нашых дзён, і "жывуць яны і тады, калі ад іх нічога не засталося, толькі ў нашай памяці" [7, с. 1]. Апісваючы гісторыю войн на беларускай зямлі, звяртае ўвагу на, здавалася б, дробную дэталь, за якой паўстае гора тысяч беларускіх сямей, страціўшых родных падчас Вялікай Айчыннай вайны: калі б можна было аддаць па хвіліне маўчання за кожнага загінуўшага беларуса, нам прыйшлося б маўчаць 38 гадоў! Сіпакоў узгадвае і чарнобыльскую трагедыю, якая заставіла закопваць у зямлю, хаваць свае хаты многіх жыхароў Беларусі. І нават апошні абзац эсэ "Нашы хаты", напісаны ў характэрнай для Сіпакова лірычнай манеры, прасякнуты тугой і болем за страчанае: "Хата, хатачка, свяцёлка, хаціначка, святліца, хатанятка. Шырокія вокны, сасновыя бёрны – яшчэ пахнуць смалою. Дыхтоўны ганак. Маці на ім – яшчэ маладая і прыгожая. На двары бацька запрагае каня... Сонца, неба і птушкі – яны спяваюць.

І ты перад хатаю – маленькі, але ўжо крыху вышэй за траву. І цялятка, нагрэтым ад сонца лобікам – лёгенька так бадзецца ў твой жывоцік – нібыта запрашае пагуляць з ім...

Колькі пакаленняў беларусаў менавіта такою бачылі праз стагоддзі сваю хату!

Бачылі толькі жывою..." [8, с. 145].

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Блізкія да эсэ цыкла "Партрэт Беларусі" па ідэях, узнятых у творах, рэпартажы Сіпакова з нагоды вяртання ў Полацк копіі крыжа св. Ефрасінні Полацкай, выкананай мастаком Міколам Кузьмічом ("Пакланенне святыням"), і з Дня беларускага пісьменства-98 – свята, якое адбылося ў Оршы ("Свята"), а таксама артыкул "Свет дневной есть слово книжное", прысвечаны гісторыі беларускага кнігадрукавання.

Эсэ "Коні", "Мужчыны на фоне жанчынаў", "Паганцы" і іншыя арганічна далучаюцца да ўзгаданага цыкла, але яны больш агульнапланавыя, і тут аўтар ўжо не засяроджваецца толькі на адлюстраванні фактаў і з'яў з жыцця беларускага грамадства, але спрабуе філасофскі абагуліць свой жыццёвы вопыт, набытыя веды і ўласныя ўражанні.

Так, у эсэ пра паганскія святы Сіпакоў не толькі прыводзіць прыклады з беларускіх летапісаў пра барацьбу з язычніцтвам праваслаўнай і каталіцкай цэркваў, але падае сусветную гісторыю суіснавання гэтых рэлігій, пачынаючы са старажытнарымскай імперыі.

Па такім жа прынцыпе пабудаваны і твор пра "першую прыручаную чалавекам жывёлу" – коней. Тут не толькі асноўныя этапы іх прыручэння, знішчэння і штучнага гадавання парод, але і самыя вядомыя ў свеце жывёлы – коні-шахцёры, воіны, акцёры, ахвяры, конь-сенатар, помнік і нават герб. Аўтар распавядае пра мянушкі і характары, накірункі конегадоўлі ў Беларусі і коннаспартыўныя спаборніцтвы. Але праз усе старонкі і радкі яскрава бачная ўласная павага і любоў аўтара да гэтай прыгожай, добрай, працавітай жывёліны, якую ён параўноўвае з самім пачуццём, смакам, шчасцем волі: "Здаецца, конь і воля – гэта адно і тое ж. Яны нібы народжаны разам, адзін для аднаго" [9, с. 12].

Эсэ "Мужчыны на фоне жанчынаў" пабудавана на асацыятыўнай аснове, аўтар выкарыстоўвае нешмат лічбаў або фактаў, замяняючы іх сваімі разважаннямі, многія з якіх афарыстычныя па сэнсе:

"Мужчына думае пра будучыню. Жанчына пра яе марыць."

"Жанчына – гэта пытанні, мужчына – адказы на іх."

"Мужчына і жанчына – процілегласці. А барацьба процілегласцей – гэта радасць і сэнс жыцця. У тым ліку і сямейнага" [10, с. 100].

Тут можна заўважыць пранікненне іншага жанру – афарыстычных замалёвак, мініяцюр, вельмі характэрных для Сіпакова, – у яго мастацкую публіцыстыку. Гэтыя формы складаюць асобны пласт літаратурнай творчасці Сіпакова, які ляжыць на мяжы паміж журналістыкай і мастацкай літаратурай. Трэба адзначыць, што, як і ў паэзіі, прозе, у публіцыстыцы гэты аўтар нярэдка выступае як эксперыментатар, актыўна выкарыстоўваючы жанры, якія не вельмі часта сустракаюцца ў беларускай журналістыцы, вынаходзячы новыя формы іх прымянення.

Цыкл "Партрэт Беларусі" – безумоўна, самы значны ўклад Янкі Сіпакова ў айчынную публіцыстыку апошніх гадоў. Гэта спроба ўсебаковага асэнсавання гісторыі і культуры, сучаснасці беларускай дзяржавы і нацыі, энцыклапедычны па змесце і высокамастацкі па форме комплекс твораў, якія смела можна параўнаць з "Зямлёй пад белымі крыламі" Уладзіміра Караткевіча па іх значнасці ў беларускай літаратуры. Разам з тым творы Сіпакова нясуць на сабе адбітак яго ўласнага, глыбока адметнага лірычнага стылю і адрозніваюцца ў параўнанні з творамі ўзгаданага Караткевіча і нават самога Сіпакова больш ранняга перыяду большай свабодай у выяўленні аўтарскай думкі, якая стала магчымай дзякуючы зменам самой рэчаіснасці, што адбыліся ў Беларусі за апошнія дваццаць год. З'яўленне такога цыкла эсэ, безумоўна, выклікана актуальнасцю тэм, якія раскрыва-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

юцца ў творах, асабліва на фоне сучаснага актыўнага пошуку Нацыянальнай ідэі нашай краіны беларускім навуковым грамадствам. Адметнасць цыкла эсэ "Партрэт Беларусі" перш за ўсё заключаецца ў комплексным асваенні гісторыі і рэчаіснасці, апісанні і аналізе амаль усіх неабходных для існавання дзяржавы і нацыі паняццяў і з'яў. Важнасць з'яўлення твораў такога плана менавіта напачатку новага тысячагоддзя тлумачыцца і тым, што галоўнай іх ідэяй з'яўляецца скіраванасць на захаванне нацыянальных беларускіх адметнасцей, што ў кантэксце імкнення сусветнага грамадства да глабалізацыі і інтэграцыі ў палітычным, эканамічным, ваенным аспектах толькі падкрэслівае унікальнасць культуры кожнай дзяржавы, яе лепшыя гістарычныя набыткі і магчымасць укладу ў скарбніцу агульначалавечай цывілізацыі.

*ЛІТАРАТУРА*

1. ***Сіпакоў, Я.*** Дзе мы знаходзімся / Я. Сіпакоў // Беларусь. – 2002. – № 1. – С. 1-2.
2. ***Сіпакоў, Я.*** Наша зямля / Я. Сіпакоў // Беларусь. – 2002. – № 4-6. – С. 1.
3. ***Сіпакоў, Я.*** Наша вада / Я. Сіпакоў // Беларусь. – 2002. – № 9. – С. 1-2.
4. ***Сіпакоў, Я.*** Нашы дарогі / Я. Сіпакоў // Беларусь. – 2003. – № 6. – С. 1.
5. ***Сіпакоў, Я.*** Нашы святыні і сімвалы / Я. Сіпакоў // Полымя. – 2006. – № 2. – С. 41-46.
6. ***Сіпакоў, Я.*** Наш гумар / Я. Сіпакоў // Беларусь. – 2004. – № 2. – С. 1.
7. ***Сіпакоў, Я.*** Нашы замкі / Я. Сіпакоў // Беларусь. – 2004. – № 1. – С. 1.
8. ***Сіпакоў, Я.*** Нашы хаты / Я. Сіпакоў // Полымя. – 2005. – № 4. – С. 170-175.
9. ***Сіпакоў, Я.*** Коні / Я. Сіпакоў // Беларусь. –1998. – № 2. – С. 12-19.
10. ***Сіпакоў, Я.*** Мужчыны на фоне жанчынаў / Я. Сіпакоў // Неман. – 2006. – № 1. – С. 98-105.

Паступіў у рэдакцыю 13.09.2006 г.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова